Цана аддзельнага нумару у розьнічнай прадажы 3 кап.

Пролетары усіх краеу, злучайцеся!

ГАЗЭТА СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ

МАЛАДЫ АРАТЫ

Падпісвайся на МАЛАДЫ АРАТЫ!

УМОВЫ ПАДПІСКІ: У месяц 12 кап.

НАДПІСНУЮ ПЛАТУ адрасуйце на адрасу: МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63. Беларускае ДЗЯРЖ. ВЫДАВЕЦТВА.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, Рог Савецкай і Валадарскага 43/13.

Орган Цэнтральнага Камітэту ЛКСМБ. | № 96. | Серада 31 сьнежня 1924 г.

Да працоуных БССР.

(Адозва Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Савету Народных Камісараў Беларусі ў дзень шостай гадавіны Савецкай Рэспублікі Беларусі.

У цяжкіх пакутах нараджалася Вялікая Кастрычнікавая Рэволюцыя, у часы цяжкай вайны і голаду пачала яна свае дні. Асабліва цяжкі і трудны быў шлях рэволюцыі там, дзе к унутраным яе ворагам яшчэ прыбавіліся іншыя ворагі, дзе на працягу некалькіх гадоў, перакатваліся вялікія арміі, дзе ўсе вытворчыя сілы народаў былі падаўлены ўціскам сталі і жалеза.

Па такому шляху прайшоў вялікі Кастрычнік у Беларусі, разбуранай чужаземнымі насільнікамі, прыдаўленай абсацам захватчыкаў.

Ад беларускіх рабочых і сялян запатрабаваліся вялікія патугі, каб утварэньнем Беларускай Соцыялістычнай Савецкай рэспублікі замацаваць завэёвы Кастрычніка і гэтым забясьпечыць далейшую барацьбу за сваё вызваленьне.

31 сьнежня 1918 году быў падпісан маніфэст аб утварэньні Беларускай Соцыялістычнай Савецкай Рэспублікі.

Шэсьць год прайшло ўжо з тых часоў, калі вялікімі патугамі рабочых і сялян над многапакутнай беларускай зямлёю быў падняты чырвоны сьцяг—знак барацьбы, працы і свабоды. З тых часоў яшчэ каля двух гадоў ішла ўпартая барацьба беларускага пролетарыяту і сялянства, разам з працоўнымі ўсёй Расіі, за перамогу на нашай зямлі Кастрычніцкай рэволюцыі, за ўладу рабочых і сялян.

У гэтай барацьбе нас спасьцігалі няўдачы. Чырвоны сьцяг у Беларусі часам павінен быў уступаць месца беламу арлу, але цьвёрдая воля працоўных к перамозе перамагла ўсе перашкоды і дала беларускаму працоўнаму народу ўладу, права на кіраваньне сваім жыцьцём, на будаўніцтва разбуранае гаспадаркі.

Цяжкую спадчыну ад мінулага атрымала Беларуская Савецкая Соцыялістычная Рэспубліка.

У першыя дні свайго існаваньня, яна пераж..вала вялікія труднасьці, маючы зусім раскіданы адміністрац. апарат, разбураныя фабрыкі і заводы, расстроеныя гаразваротна тэрыторыі, поўныя бандытаў і шпіёнаў, з дапамогаю якіх буржуазія не пакідала спробы к падрыву і зьнішчэньню неўзмацаваўшайся рэспублікі.

Але агульнымі патугамі рабочых і сялян, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, усе гэтыя труднасьці прейдзены.

За апошнія чатыры гады існаваньня савецкай улады ў Беларусі селянін паднімае сваю гаспадарку і перабудоўвае яе на новы лад, рабочы ўтварыў новую савецкую прамысловасьць, якая з кожным днём развіваецца і мацнее, ідучы на помач селяніну. Сьляды вайны і паходаў ворагаў ужо змываюцца і забываюцца і ўва ўсіх галінах народнай гаспадаркі быстра ідзе падняцьце, нябывалае ў гісторыі панскай буржуазнай дзяржавы. Адначасна з ростам гаспадаркі ідзе развіцьцё культур нацыянальнасьцяў, насяляючых Беларусь. Савецкая ўлада ўмацавілася, аб'яднаўшы вакол сябе ўсё працоўнае насяленьне рэспублікі.

Адзначаючы гэтыя посьпехі і дасягненьні, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт у дзень шостай гадавіны ўтварэньня Беларускай Соцыялістычнай Савецкай Рэспублікі зьвяртаецца да ўсіх працоўных Беларусі яшчэ цясьней аб'яднацца вакол сваіх саветаў, яшчэ дружней, агульнаю працаю рабочага і селяніна дасягнуць поўнасьці пабеды на фронце нашага соцыялістычнага будаўніцтва.

Агульнымі сіламі, пры цесным яднаньні з усімі савецкімі рэспублікамі, мы ня толькі замацуем победу Вялікага Кастрычніка перад угасаючым капіталістычным сьветам, але зможам зьдзейсьніць перамогу соцыялізму на ўсёй зямлі

Няхай жыве пролетарыят і сялянства Беларусі, здабыўшыя сабе свабоду сваёю крывёю і працаю.

Няхай жыве савецкая ўлада на ўсім сьвеце!

Часьць і слава згінуўшым у барацьбе за вызваленьне працоўнага народу!

Старшыня Цэтр. Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР І. Адамовіч.

Сакратар ЦВК БССР Чарнушэвіч

Менск 31 сьнежня 1924 г.

„Маладому Комуністу“

гарачае комсамольскае прывітаньне.

У лістападзе вышаў з друку першы нумар часопісі „Малады Комуніст“—орган ЦК Комсамолу Заходняй Беларусі.

„Малады Араты“ шчыра вітае свайго новага сабрата.

Ва ўступным артыкуле „Маладога Комуніста“ гаварыцца

Перад Комсамолам Заходняй Беларусі стаяць вялікія перашкоды. Але Комсамол ня траціць энэргіі.

«Хоць і шалее дзікая рэакцыя, хоць панскі бізун мабілізуе процiў нас хмары шпікаў, правакатараў і паліцыі—«Малады Комуніст» ня дасьць распыліцца нашым організацыям пад ударамі правалаў і арыштаў.

Мы кажам «Моладому Комуністу»—цьвёрда стой на слаўнай варце, высока трымай сьцяг Комсамолу пад абяздоленай Заходняй Беларусьсю.

«Малады Араты» вольнай савецкай Беларусі горача па комсамольску вітае цябе—новага байца за вызваленьне працоўных.

Ад выдауцы.

(Старонка з „Маладога Комуніста“).

Наш Комсамол Заходняй Беларусі, які ніколі ня бачыў легальнага існаваньня, заўсёды прыгнечаны і загнаны ў падпольле, перажывае цяпер нячувана цяжкія дні рэакцыі.

У Вільні пасьля разгрому ўсёй арганізацыі дыфэнзыва на кожным кроку пасадзіла сваіх інформатараў, забясьпечыўшы сябе некалькімі правакатарамі і гэтым на даўгі час пазбавіла нас магчымасьці шырака разьвярнуцца; у Горадні і Беластоку, нават, профсаюзы сталі нелегальнымі і гэта моцна перашкаджае нашай сувязі з беспартыйнай моладзьдзю; арышты ў Пінску, ў вёсках Горадзенскай акругі—вось хроніка выпадкаў за апошнія 2-3 месяцы.

Але ўсё гэта можа толькі часова затрымаць, часткова пашкодзіць нашай працы, але не заб'е яе, ня спыніць.

Ня гледзячы на ўсе перашкоды, на немагчыма цяжкія ўмовы нашага існаваньня, за тыя-ж 2-3 месяцы мы выраслі, бадай, у два разы, у шмат разоў сталі мацнейшыя.

А перад намі яшчэ большыя заданьні, яшчэ больш сур'ёзныя і важныя прадпрыемствы.

Нам трэба яшчэ цясьней зьвязацца з беспартыйнай моладзьдзю, глыбей увайсьці ў вёску, зрабіць нашы організацыі запраўды бальшавіцкімі.

І дапамогай нам, палёгкай у гэтай труднай працы ў нячувана цяжкіх умовах, будзе наша газэта, наш «МАЛАДЫ КОМУНІСТ».

Хоць і шалее дзікая рэакцыя, хоць панскі ўрад мобілізуе процiў нас хмары шпікаў, провакатараў і паліцыі,—«МАЛАДЫ КОМУНІСТ», скрытымі ручаінкамі прабраўшыся ў кожны горад, мястэчка і вёску, дзе толькі гарыць агоньчык Комсамолу, дапаможа нам трымаць цесную сувязь, не дасьць распыліцца пад ударамі правалаў і арыштаў.

«МАЛАДЫ КОМУНІСТ» будзе падтрымліваць у нас бадзёрасьць у часы занападу, уліваць сілу і энергію, паведамляючы аб нашых перамогах.

«МАЛАДЫ КАМУНІСТ» будзе вучыць нас, паказываючы нам нашыя памылкі, даючы дырэктывы, як лепш і з большым посьпехам змагацца з нашым моцным і страшным ворагам-капіталістам.

«МАЛАДЫ КОМУНІСТ» будзе адной з тых ніточак, якая зьвяжа ўсіх нас, маладых работнікаў і сялян—беларусаў, жыдоў, палякоў і літоўцаў—для барацьбы з супольным ворагам—польскім буржуазным ладам—за вызваленьне і злучэньне нашай Заходняй Беларусі з Савецкай Беларусьсю.

«МАЛАДЫ КОМУНІСТ» урэшце, дапаможа нам стаць запраўднымі комуністамі—такімі, якімі вучыў нас быць ЛЕНІН.

Дык любеце-ж «МАЛАДОГА КОМУНІСТА», дапамагайце яму, пішаце ў яго аб усіх сваіх радасьцях і горы, паражэньнях і перамогах, пашырайце ўсюды, нясеце яго ў масы моладзі! Толькі нашымі агульнымі высілкамі, агульным падтрыманьнем «МАЛАДЫ КОМУНІСТ» стане нашым другам, нашым правадыром і вучыцелем у барацьбе за рэволюцыю, за Савецкую Ўладу!

ЦК КСМ Заходняй Беларусі.

Юбіляру У. М. ІГНАТОУСКАМУ.

Усевалад Макаравіч!

50 маладнякоўцаў, як адзін, вітаюць сягоньня ў твой пачэсны сівы пятнаццацёхгадовы юбілей цябе, як старога маладнякоўца адраджэньня Беларусі.

Каб аформіць тваё становішча як „старога маладнякоўца“, „Маладняк“ залічае цябе ганаровым сябром аб'яднаньня:

Маладняк—Менск, Віцебск, Полацк, Масква, Веска.

У. М. Ігнатоускі.

(Кароткі біаграфічны нарыс).

Усевалад Макараў Ігнатоўскі нарадзіўся ў сям'і вясковага настаўніка ў 1881 годзе 19 красавіка ў в. Токарох, Горадзенскай губ., Бярэсьцейскага павету.

Бацька Усевалада Макар Ігнатоўскі сын селяніна, які яшчэ адбываў прыгон.

Атрымоўваючы 11 р. у месяц пэнсіі, бацька Усевалада паслаў яго вучыцца ў Віленскае духоўнае вучылішча.

За ўдзел у адным з бурсацкіх бунтаў адзін раз Усевалад М. быў абстрыжан тупой машынкай. Будучы ўжо ў сэмінарыі У. М. прымаў актыўны ўдзел у бунце сэмінарыстых супроць адміністрацыі. За гэты бунт У. М. быў звольнен з Віленскай сэмінарыі і паступіў у Магілёўскую сэмінарыю, якую скончыў у 1902 г.

Па сканчэньні сэмынарыі т. Ігнатоўскі паступіў у Ленінградзкі ўнівэрсітэт. Там т. Ігнатоўскі організоўваў рэволюцыйныя студэнцкія гурткі і знаёмыўся з жыцьцём ленінградзкіх рабочых. У 1904 г. Ігнатоўскі за ўдзел у дэманстрацыі з рабочымі быў арыштаваны і адсядзеў больш трох месяцаў.

У 1905 г. т. Ігнатоўскі высылаецца паліцыяй з Ленінграду на бацькоўшчыну. Горадзеншчыны ён ухітрыўся перабрацца ў Вільню, дзе пазнаёміўся з «Бел. Соц. Грамадой».

У 1906 г. т. Ігнатоўскі зноў залічыўся ў Ленінградзкі ўнівэрсытэт, дзе быў да восені 1907 г. і вёў агітацыйную політычную працу сярод рабочых. Паліцыя высачыла гэта і Ус. М. быў арыштаваны і высланы ў Ладзейнае поле, Алонецкай губ.

У 1909 г. т. Ігнатоўскі залічваецца ў Дэрпцкі ўнівэрсытэт, які скончыў у 1911 г. 19 лістапада 1909 г. т. Ігнатоўскі разам з другімі студэнтамі беларусамі шле прывітаньне беларускай газэце «Наша Ніва».

Па сканьчэньні ўнівэрсытэту У. М. Ігнатоўскі зрабіўся настаўнікам ў Віленскай прыватнай гімназіі. У Вільні жыў з 1911 па 1914 г. і вёў падпольную рэволюцыйную працу сярод салдат.

У 1914 г. У. М. Ігнатоўскі прызначаецца выкладчыкам гісторыі і экономічнай геаграфіі ў Менскі Настаўніцкі Інстытут.

Пры нямецкай окупацыі У. М. Ігнатоўскі працуе ўжо на чале інстытуту да 1920 году. Трэба адзначыць, што У. Ігнатоўскі далёка не абмяжоўваўся ў інстытуце толькі афіцыяльнымі лекцыямі, а вёў увесь час і сваю політычную справу сярод студэнтаў інстытуту.

Рэволюцыйная і культурна-нацыянальная праца Ігнатоўскага сярод студэнтаў і настаўнікаў інстытуту вызначаліся з асаблівай яснасьцю ў момант яго жыцьця ў Яраслаўлі. Тут Ігнатоўскі з'арганізаваў гурток «Маладая Беларусь», які паслужыў рэволюцыйным ядром, з якога пры бела-польскай окупацыі ўтварылася падпольная «Беларуская комуністычная організацыя».

У канцы 1918 г. і першай палавіне 1919 г. немцы пакідаюць раптоўна Беларусь. Прыходзіць на Беларусь зноў сав. улада, але толькі на некалькі месяцаў.

Зьнявага працоўных беларускіх масаў немцам, а затым і «яснавельможнымі панамі, робяць надзвычайна цяжкае ўражаньне на У. М. Ігнатоўскага. Ен рашуча кідае педагогічную справу і выключна бярэцца за рэволюцыйную працу. Студэнцкі гурток „Маладая Беларусь“ па думцы яго сяброў і Ігнатоўскага рэорганізуецца пад яго кіраўніцтвам у „Беларускую комуністычную організацыю“. Стварыўшы новую організацыю, У. М. Ігнатоўскі ўвесь с галавой уваходзіць у гэту працу і, як вопытны і асьцярожны корчмы, кіруе ёй у падпольлі аж да самага прыходу ў Менск Чырвонай арміі ў сярэдзіне 1920 г.

Пад кіраўніцтвам членаў «Бел. Ком. арган.» пачалі хутка арганізоўвацца сялянскія паўстанчыя аддзелы, якімі кіраваў У. М. Ігнатоўскі.

У дзень вызваленьня ад белапалякаў Менску на кватэры Ігнатоўскага зьбіраецца сход паўстанчага камітэту «Бел. Ком. Організацыі».

Пасьля сходу Ігнатоўскі ідзе на перагаворы і для інформацыі да прыехаўшага ў Менск А. Чарвякова і Кнорына. Ствараецца тымчасовы Рэволюцыйны Камітэт Беларусі, куды ўваходзіць і У. М. Ігнатоўскі.

Рэўком назначае Ус. Ігнатоўскага, я і праз паўстанчыя аддзелы стаў вядом беларускаму сялянству, Народным Камісарам Земляробства: на гэтай пасадзе Ігнатоўскі быў да 1921 г., у 1921 г. У. М. Ігнатоўскі набіраецца Усебеларускім Зьездам Саветаў на пасаду Народнага Камісара Асьветы, якім ён зьяўляецца і ў сучатны момант.

За навуковую працу па гісторыі Беларусі і гісторыі рэволюцыйнага руху на Беларусі Ус. М. Ігнатоўскі атрымаў у 1922 г. званьне профэсара і пры начам быў профэсарам у Бел. Дз. Унівэрсытэт па катэдры гісторыі Беларусі, дзе ён чытае свае лекцыі і цяпер. Па партыйнай лініі Ус. М. Ігнатоўскі займае ў сучасны момант вельмі адказную пасаду. Ен зьяўляецца членам Бюро ЦК КПБ(б) і загадвае агітацыйна-пропагандыцкім аддзелам пры ЦК, а таксама разам з тым тав. Ігнатоўскі зьяўляецца членам Прэзыдыуму ЦВК БССР і СССР.

Рэлігія—дурман для народу.

Уладзімір Ільліч пра рэлігію.

(З артыкулаў Леніна).

Экономічнае прыгнячэньне рабочых няміну́ча выклікае самыя разнастайныя формы прыгнячэньня політычнага, прыніжэньня соцыяльнага, агрубеньня і зацямненьня духоўнага жыцьця мас

Рэлігія ёсьць адною з форм ўдухоўнага прыгнёту, які ўсюды ляжыць на народных масах, прыдушаных вечнаю працаю на другіх, беднасьцю і адзіноцтвам.

Таго, хто ўсё жыцьцё працуе і чуць-чуць зводзіць канцы з канцамі, рэлігія навучае быць пакорным і цярплівым у зямным жыцьці, абяцаючы ўзнагароду на небе. А тых, хто жыве чужою працаю, рэлігія заклікае да дабрачыннасьці ў зямным жыцьці, прапануючы ім вельмі таннае апраўданьне для ўсяго іх эксплёататарскага існаваньня і прадаючы па сходнай цане білеты на нябесны дабрабыт.

Рэлігія ёсьць опіум для народу. Рэлігія—гэта род духоўнай сівухі, у якой рабы капіталу топяць свой чалавечы выгляд, свае вымаганьні хоць колькі-небудзь дастойнага чалавечага жыцьця.

Сучасны сьвядомы рабочы, выхаваны буйнаю фабрычнаю прамысловасьцю, асьвечаны гарадзкім жыцьцём, з ганьбаю адкідае ад сябе рэлігійныя забабоны, пакідаючы неба папом і буржуазным багамольцам і здабываючы сабе лепшую долю тут, на зямлі.

Сучасны пролетарыят становіцца на бок соцыялізму, які прыцягвае навуку да барацьбы з рэлігійным дурманам і вызваляе рабочага ад веры ў загробнае жыцьцё тым, што гартуе яго для сапраўднай барацьбы за лепшае жыцьцё на зямлі.

Толькі клясавая барацьба рабочых мас, усебакова ўцягваючы самыя шырокія масы пролетарыяту ў сьвядомую і рэволюцыйную грамадзянскую практыку, можа на справе вызваліць прыгнечаныя масы ад уціску рэлігіі.

Рэволюцыйны пролетарыят даб'ецца таго, што рэлігія стане прыватнаю справаю для дзяржавы. І ў такой, ачышчанай ад цьвілі, політычнай організацыі, пролетарыят павядзе энэргічную барацьбу за зьнішчаньне экономічнага рабства—сапраўднай крыніцы рэлігійнага ашукваньня чалавецтва.

Мы патрабуем, каб рэлігія была прыватнаю справаю ў адносінах да дзяржавы, але мы ніяк ня можам лічыць рэлігію прыватнаю справаю ў адносінах да нашай уласнай партыі.

У адносінах да партыі соцыялістычнага пролетарыяту—рэлігія ня ёсьць прыватная справа.

Казкі пра Хрыста.

Эвангэльская блытаніна.

Есьць у дзяцей любімая забава: зробяць з картаў дом, страху і сьцену. Дом выходзіць зусім як сапраўдны, а зачэпіш пальцам—раскідаецца.

Вось таксама рассыпаюцца й рэлігійныя павер'і, калі зачапіць іх. Чалавек павінен зачапіць гэтыя павер'і розумам. Ен сам, калі ён прывык жыць так як вучыць розум, сам пастараецца разабрацца—што, дзе і як.

Папы гавораць Хрыстос быў рабіў цуды.

Але мала казаць. Ты дакажы.

Аб жыцьці Хрыста гавораць чатыры эвангэльлі. Здавалася-б, што аб адным Хрысьце адно пісаньне павіна было б быць у чатырох эвангэлчлях. А на дзеле выходзіць тут такая блытаніна, такая неразьбярыха, што аж дзіва. Вось папрабуем разабрацца ў гэтай кашы

Блытаніна першая.

Папы вучаць цёмных людзей што эвангэлісты—вучанікі Ісуса—апісвалі тое што самі бачылі.

А мы ведаем, што самае старое эвангэльле—жыцьцё і апісаньне Хрыста—ад Марка напісана толькі 150 гадоў пасьля нараджэньня Ісуса.

Другі-ж эвангеліст—Лука, сам прызнаецца! пішу—кажа ён—аб тым, што мне расказалі людзі аб Ісусе і напісана яно гадоў за 300 пасьля нараджэньня Ісуса.

Блытаніна другая.

Эвангэліст Марк быў, кажучы папашаму, сэкратаром апостола—вучаніка Хрыста Пятра. З яго слоў ён і напісаў сваё эвангэльле. Здавалася-б што гэтая эвангельле павіна быць самым поўным, бо Пётры быў самым блізкім к Хрысу вучанікам. А між тым у яго ніводнага слова няма аб нараджэньні Хрыста з такімі цудамі, як зьяўленьне зьвязды, анельскія сьпевы, пакланеньне валхвоў, ізбіеньне дзяцей Ірадам і г. д.

Як гэта разумець? А справа ў тым, што даўнейшым папом стала выгадна для большага зацямненьня народу прыпісаць Хрысту пабольш цудаў. Яны гэта зрабілі ў пазьней напісаных эвангэльлях.

Блытаніна трэцяя.

Па самых старых казках, Хрыстос быў сынам сталяра Іосіфа, а сам рыбаком. Але папом было выгадна мець прыхажанамі багатых і знатных. А багачом было-б няпрыемна пакланяцца простаму рыбаку, які й сам ня думаў, што праславіцца на ўвесь сьвет.

Загэтым, багачом наруку, новае эвангэльле ад «Матфея» пералічвае Хрыстовых дзядоў і прадзедаў цароў і іншых важных людзей даказваючы, што Хрыстос мала таго, што бажэсьцьвенны, а яшчэ й царскага пахаджэньня.

Блытаніна чацьвертая.

Эвангэліст «Матфей» расказвае, што па дарозе на пакланэньне к народжанаму Хрысту мудрацы—валхвы зайшлі к Іраду-цару. А між тым, гісторыі таго часу даказваюць, што Ірад памёр за 4 гады да нараджэньня Хрыста.

Другі эвангэліст Лука гаворыць, што Хрыстос радзіўся ў той час, калі ў Палясьціну быў назначан правіцель Квірыній намесьнік рымскага цара. А між тым, точна вядома, што Квірыній быў назначан цераз 10 год пасьля сьмерці Ірада—значыць, цераз шэсьць год пасьля нараджэньня Хрыста.

Той жа самы Лука гаворыць і поўную недарэчнасьць—што пры жыцьці Ірада аказваецца і прапаведваў ужо 34-х гадовы Хрыстос. Добры, значыць, штукар быў Ірад, калі цераз 38 гадоў пасьля свае сьмерці служыў.

Так можна падабраць не адзін дзесятак путаніц між эвангэлістамі. А гісторыкі таго часу, якія запісвалі ўсякія здарэньні з жыцьця свайго народу, ні адным словам не ўпамінаюць пра Хрыста.

Вось і выходзіць, што эвангэлісты запісвалі толькі розныя казкі. Перабліталі яны й імі і часы і напісалі такую путаную казку аб жыцьці Хрыста.

Дзе калядная праўда?

Хто ня бачыу, як часамі,
Нашы дзеці возьмуць карты
І будуюць сабе самі
Хатку проста не на жарты.
Ня чапай—стаіць хаціна,
Але дзьмухні, хоць бы крыху—
Паляціць, як павуціна,
Уся будовіна ад дыху!
Калі глянем у куточак—
З нашай верай гэтак сама:
Гладка зьвязаны вяночак.
Ад Адамы да Абрама.
Добра усюды—ва усе бокі;
А крапі, хоць чуць мазгамі—
І усе твае прарокі
Дагары ляцяць нагамі.
Возьмем Коляды. У школе,
Кожны чуу, калі вучыуся,
Што на Коляды у стадоле
Віфляемскай нарадзіуся
Божы сын ад боскай маткі,
Што уцякала з Назарэту,
Дзе завеу свае парадкі
Ірад—злодзей усяго сьвету.
Далей—болей нам чыталі,
Як Хрыстос хадзіу па мору,
І за што яго расьпялі,
Бяз усякага разбору.
Хоць і думалася крышку,
Усе мы верылі спачатку,
Покуль самі, узяушы кніжку,
Ня зьмікіцілі загадку...
Каб другому ня здавала,
Што Дзяркач зрабіуся хлусам,
Расказау бы усе ад мала,
Што было і як з Ісусам...
Але гэта на астатак,—
Будзе час на той нядзелі,
А сягоньня нядахватак,
Да і думкі аслабелі.
Па другое—памагчыма:
Бо у Мацьвея і у Яна—
Глянь уласнымі вачыма
Ужо да пельгасьці налгана!
Покуль што—зматай на вусы:
Піша Ян нам не для зьдзеку,
Што бацькі —дзядзькі Ісуса
Жылі плотніцтвам спрадвеку—
А Мацьвей—апостал піша
На інакшую ужо моду,
Што Хрыстос ня гэблям дыша,
Што ен царскаго уроду...
Дзе-ж праудзівая крыніца?
Ці у Мацьвея, ці у Яна?
Ці у абоіх нябыліцца
Пра «царэвіча Івана»

А. Дзяркач.

Няма няшчасьця бяз шчасьця.

БАГАРОДЗІЦА—Божа, што мне з Ісусам рабіць?! Адбіўся зусім ад рук, карону лучыстую закінуў, ды ў піонэры залічыўся...

БОГ-БАЦЬКА: У піонэры?

Ага, гэта добра. Калі ў мяне сын будзе ў піонэрах, дык мяне, можа, у профсаюз прымуць. А то ніяк пасады не знайду.

Слова сэкратара ячэйкі.

(Да каляднай антырэлігійнай кампаніі).

Вось яно сьвята—„Нараджэньне Хрыста»—каляды. Як у часы ўсіх падобных сьвятаў, мы павінны ўсёй комсамольскай ячэйкай павесьці барацьбу супроць бога. У вёсцы комсамол пасьпеў зрабіць 2—3 вылазкі супроць багоў, чарцей, ведзьмаў ды іншых паверьяў, вельмі распаўсюджаных у нашай Беларускай вёсцы, дзе веруючае сялянства ведае ня толькі рэлігійныя павер'і і рэлігійныя байкі; ды і павер'і іншых нацыянальнасьцяў. Дзеля гэтага антырэлігійная пропаганда, у нашай вёсцы яшчэ боль важная.

Гэтыя ўмовы прымушаюць нас памысьліць аб вельмі асьцярожным падходзе да антырэлігійнай пропаганды ўва ўсякія рэлігійныя сьвяты і асабліва ў такія вялікія, як каляды і вялікадня, каб няўмелым крокам не абурыць на сябе сялянства, якое не заўжды «на слова» верыць маладому хлопцу.

У нас ёсьць вопыт мінулых гадоў, які нам гаворыць аб тым, што некаторыя вясковыя комсамольскія ячэйкі, так перастараліся ў агітацыі супроць багоў і рэлігійных сьвятаў, што заміж таго, каб адбіць ахоту ў сялян хадзіць у царкву ўзбурвалі сялян супроць сябе.

Прычыны гэтага былі такія: ячэйкі няўмела правадзілі працу. Адразу пачыналі гаварыць аб тым, што няма бога, што ўсё гэта казкі і разам з гэтым нічога не гавораць з навуковых ведаў, якія па зразумелым кніжкам льга было пераказаць сялянству.

Такога чыну шчырая агітацыя па існуючым прыказкам, робіць для комсамолу «мядзьведзявую ўслугу» і ўзбурая супроць ячэйкі сялянства.

Вось некалькі фактаў з агітацыі мінулых год, цалком падкрэсьліваючых вышэй надрукаванае: У Заслаўскім раёне, Менскай акругі, комсомольцы так узяліся за агітацыю супроць бога, што ня стрымоўваючы сваіх антырэлігійных пачуцьцяў прастрэлілі на шляху крыж з расьпяцьцем, але ў гэты час здарыўся прыкры выпадак — разарвала стрэльбу і комсамольцу адарвала палец.

Пасьля гэтага пашлі гутаркі сярод сялян усёй акругі, што „вось, бачыце, як комсамольцаў карае бог за іх учынкі і нявераваньні". Гэты выпадак комсамольцы памятаюць і да гэтага часу. Праўда, некаторым з іх удалося давесьці і пераканаць, што гэта вельмі рэдкі нечаканы выпадак, што гэта залежыла ад стрэльбы і што ніякага бога няма. Усё-ж такі ў патрэбную хвіліну яны лічаць патрэбным перадаць аб гэтым факце (такія факты наадварот, яшчэ больш замацоўваюць веру ў бога), які адбыўся 2 гады назад.

Вось другі прыклад падобнай агітацыі: адзін комсамолец вёскі С. вырашыў, што ён ня верыць у бога, дзеля гэтага можа сьмела адабраць у веруючых бацькоў абразы, і як непатрэбны хлам выкінуць у рэчку. Бацькі даведаўшыся аб гэтым, наперш моцна адлупцавалі хлопца, рашыўшы правучыць хлопца на будучы час, а пасьля выгналі з хаты. І добра, ведай, як пераконваць сваіх бацькоў у тым, што бога няма. Хлусьню аб богу трэба тлумачыць розумам і навуковымі довадамі.

Гэтыя «акасіі» здарыліся з комсамольцамі ў самы разгар рэлігійнага сьвята, і што-ж вы мысьліце?..

— Гэта толькі пашкодзіла справе. Сяляне мацней сталі верыць у бога, нават і тыя, якія былі на шляху бязьвер'я, зноў варочаліся да вераваньня і больш правікаліся пашанай да папа прадстаўніка няіснуючага бога.

Дык вось што, сябры, раней, чым казаць аб неіснаваньні бога, трэба самому добра падрыхтавацца і зразумець — чаму няма багоў, чарцей; адкуль узялася рэлігія і чаму карысна яна панам ды буржуазіі і вельмі шкодная рабочаму ды селяніну—зацемняючы яго сьвядомасьць, адхіляючы ад жыцьцёвай праўды і рэволюцыйнай барацьбы за сваё вызваленьне.

Рэлігія робіць з чэловека, які верыць у розных богоў, паслухмяную жывёлу.

Аб усім гэтым і на цякучыя пытаньні, якія я буду ставіць у сваім слове, адказваць ня буду, няхай хлопцы самі памысьляць—пашавеляць мазгамі, пачытаюць кніжку, а тады і пойдуць адказ на мае пытаньні.

ЛКСМ увесь мінулы час быў і будзе самым злосным ворагам рэлігіі і бога. Хоць мы мелі розныя памылкі, але яны наадварот, яшчэ больш замацуюць нас, у працы свае антырэлігійнай справы і будуць добрым прыкладам, як трэба падыходзіць у будучыне.

ЛКСМ павінен будзе актыўна змагацца з рэлігіяй ды богам—да тых часоў пакуль мы ня зробім усіх рабочых ды сялян няверуючымі (хоць рабочых веруючых значна менш, чым сялян).

Праца належыць вельмі вялікая і да яе трэба вельмі ўважліва рыхтавацца кожнаму комсамольцу.

Знача, мы, сябры, запамятаем, што менш за ўсё агітацыя супроць бога только тады, калі кожны з нас упэўнены, у сваёй праўдзівасьці і довадах, упэўняючых сялян у тым, што бога няма. Робячы гэта з падходам, не пачынаючы адразу—„бога няма» ды скончана, а дзеля гэтага ты, селявін, ня вер, бо я комсамолец за цябе сьвядомейшы. та будзе настолькі шкодна, сколькі шкодны 2 вышэй [illegible] саных факты акты-рэлігійнай пропаганды. Ужо ўсе ячэйкі па[illegible] ны энэргічна ўзяцца ды ры[illegible] вацца да провядзеньня акты[illegible] лігійнай пропаганды ў часы [illegible] ядаў. Як у гэтыя каляды, [illegible] і ў будучым трэба зусім адмо[illegible]

Па комсамольскіх весках.

Як праводзілася 6-я гадавіна ЛКСМБ.

(Ліст з Масквы).

У вялікай залі Комуністычнага Унівэрсытэту Нац. Мен. Заходу голасна нясуцца комсамольскія сьпевы.

То комсамольцы з Беларусі далёка ў Маскве сьвяткуюць шостую гадавіну існаваньня Ленінскага Комсамолу Беларусі.

Шмат комсамольцаў з Беларусі ў Маскве. У большай частцы актыўныя працаўнікі комсамолу Беларусі, цяпер вучацца.

Сягоньня ўспомінаюць прайшоўшыя дні барацьбы і будаўніцтва. Пагаварыць, успомніць было каму і аб чым: Ахменяў Крэмнёў, Разоўскі і іншыя.

Віталі нас т. т. Кнорын, Шукайла і Паўлюкевіч.

Усе адмечалі наш узрост уздым, але гаварылі і аб тым, што паперадзе працы таксама шмат.

Т. Кудзелька адмеціў, што Беларускі комсамол нарадзіў новых пісьменьнікаў і сотні такіх яшчэ ўзрастаюць на старонках комсамольскіх газэт.

У канцы ўрачыстага пасяджэньня гарачае прывітаньне ЦККПБ і ЦККСМБ правадыром двух пакаленьняў працоўных мас Беларусі.

Такое-ж гарачае прывітаньне комсамольцам Заходняе Беларусі з надзеяй, што хутка ўсе гадавіны будзем сьвяткаваць разам.

Пасьля ўрачыстага сходу студэнтамі Белсэктару і студыі была наладжана п'еса з жыцьця партызан камсамальцаў «Чырвоныя кветкі Беларусія.

З добрым уражэньнем разхадзіліся прысутныя.

Вечар успомніў, дні змаганьня і працы на Беларусі. Больш усе заахвоціліся налегчы на вучобу, каб хутчэй скончыць: паехаць працаваць на Беларусь. Янка Дубок.

ЦК КПБ і ЦК ЛКСМБ.

Мы зышоўшыся ў шостую гадавіну існаваньня Ленінскага комсамолу Беларусі, комсамольцы беларусы гор. Масквы шлем гарачае прывітаньне ЦК КПБ: ЦК ЛКСМБ, як правадыром работніцка-сялянскае рэволюцыі, якая вызваліла з-пад цяжкага капіталістычнага ўціску працоўныя масы Беларусі і дала магчымасьць пролетарскай моладзі Беларусі будаваць сваё жыцьцё пад Чырвоным сьцягам. Мы выказваем сваю надзею на тое, што ў бліжэйшую гадавіну ЛК СМБ мы будзем сьвяткаваць разам з вызваленай моладзью Заходняй Беларусі.

Няхай жыве і мацнее ЛКСМБ

Няхай дрыжыць польская панская ўлада перад нашай узрастаючай сілай.

Паўтары тысячны сход комсамольцаў беларусоў у Маскве.

Месца ёсьць.

(Капыль, Слуцкае акругі).

Да гэтага часу мы дзяцьмі малымі былі. Пускаць нас нікуды ніхто не хацеў. Пойдзеш пагуляць куды небудзь—убачаць, прагоняць.

Лічылі ўсё нас за дзяцей. Але вось чую я, кажуць, што дзецям месца далі: усіх прынялі ў атрад піонэраў.

Запісаўся я сам у піонеры і, месца ўсім цяпер ёсьць. Цягацца цяпер мы ня будзем, мы заняты дзелам адным—вучыцца па Леніну.

Піонэр А. Малевіч

10 і 8 школы.

З 15/х, пасьля 4-х месячнага перарыву, пачалася праца гуртка беларусазнаўства, пры 10 і 8 школах. У працы гуртка, акрамя настаўніка беларусазнаўсва 10

школы, прымае ўдзел і настаўнік 8 школы. Сяброў у гуртку 30. Усе яны прымаюць удзел у трох сэкцыях: у політычна-літаратурнай, харавой і драматычнай. У політычна-літаратурнай сэкцыі зроблены сябрамі даклады: аб Польскіх крэсах і Англо-Егіпэцкім конфлікце. Акрамя таго настаўнік 8 школы, зрабіў даклад аб разьвіцці беларускай літаратуры. Пры гуртку ёсьць бібліотэка з 20 кніжак, якая пашыраецца за кошт сяброўскіх узносаў.

М. Палесс.

Кулакі гуляюць,

Яшчэ адзін.

(Бабруйская акруга).

Кулак у вёсцы цяпер падымае галаву. Часта мы чытаем у газэтах, што там то сям у вёсцы забілі комсамольца сэкратара ячэйкі, селькора альбо савецкага працаўніка. Гэтае здарэньне адбылося і ў нас у Бабруйскай акруге. Толькі ўчора мы пахавалі забітага кулаком т. Ярмалаява, які быў сэкратаром ячэйкі ў вёсцы ІІ-га Бобруйскага раёну. Забіты ён быў за тое, што выказаў самагоншчыка. Гэткія выступленьні даказваюць нам, што кулак у вёсцы, нават, дабіраецца да галавы нашага актывіста вёскі. Тав. Ярмалаяў паў ад удара дубіны. Гэта забойства ня першае. Нас гэтым не запалохаюць. Над магіламі сваіх таварышоў плакаць ня будзем, а яшчэ цясьней самкнем свае шэрогі і шырэй разьвернем працу ў вёсцы, каб яе вывясьці на новы шлях.

Сьмерць нашага таварыша ня пройдзе дармова, драпежныя забойцы хутка стануць перад пролетарскім судом і панясуць належную кару.

В. Парыбак.

Комсамольцы дапамаглі.

(в. Горадзецк, Дрыбінскі р.)

У беднага гаспадара памянёнай вёскі ўкралі карову, выскачыў на двор селянін, спазьніўся на паўгадзіну—каровы няма.

Набег у комсамольскі клюб, узяліся хлопцы за справу хоць і доўга хадзілі па палёх ды лясох, але-ж урэшце знайшлі.

Пасьля гэтага выпадку комсамольцы карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод сялян.

С. Сялібіраў.

На 30 двароу 2 газэты.

(в. Асёткі, Высочанскага с.-с. Віцэбскай акругі).

Па ўсяму сельсавету ў нас зьбіраў падпіску на газэту наш гурток прыяцеляў газэты. Першы раз падпіска была ў другой палавіне кастрычніка. У вёсцы Асётках падпісаліся два гаспадары. На сьнежань падпісалася ўжо 6 чалавек. У нас у Асётках 30 двароў. Атрымаюць усяго 6 экзэмпляроў газэт. Мы кліч рэдакцыі «на дзесяць двароў адна газэта» выпоўнілі.

Я. Б.

З лені, дык нічога ня зробіш...

(Чырвоная Слабада, Случчына)

Комсамольцы нашай Чырвона-Слабодскай ячэйкі зусім залenаваліся. Калі надышло сьвята шостае гадавіны ЛКСМ, то яны нічога і не зрабілі. Сьвята было, як ня сьвята, а так сабе дзень. Урачыстае пасяджэньне зрабілі на другі дзень. Чыя гэта віна? Віна комсамольцаў, а яшчэ больш—сэкратара... Сэкратары! папраў сваю віну, бо ў другі раз гэта будзе кепска. Так рабіць брыдка! У другі раз папраўся.

Быльнік.



ца ад правядзеньня масавых супроць—рэлігійных сьвятаў, дзеля таго, што ўвесь шум, які падымаецца масавай дэмонстрацыяй, нічога не дае веруючым сялянам.

У момат самых калядаў трэба рабіць вось што; ячэйкі пры дапамозе сьвядомых таварышоў (партыйцаў, настаўнікаў, аграномаў і г. д.) павінны правесьці чыткі, агранамічныя гутаркі, вечар агранамічнай прапаганды, прыродазнаўчыя, навуковыя гутаркі (дзе можна было-б вельмі добра, правесьці, вечар з сьветавымі малюнкамі).

Трэба гэту працу праводзіць у самым цесным злучэньні з парт. ячэйкай. Ячэйка ЛКСМ адна ня можа справіцца з такой вялікай адпаведнай працай.

Ячэйкі скарыстаюць падсобныя матар'ялы мінулых гадоў. Гэта — найлепшыя антырэлігійныя вечары, а калі няма, дык разам з парт'ячэйкай запрашаюць настаўніка, агранома, а не, дык сьвядомага партыйца, які-б зрабіў даклад, правёў гутарку. На сходзе ячэйкі трэба паставіць даклад „чаму мы супроць рэлігійных сьвятаў".

Гэты даклад паможа самым комсамольцам, асабліва новым, уступіўшым нядаўна ў Л. К. С. М. высьвіць чаму К. С. М. супроць багоў і як комсамолец павінен трымаць сябе ў адносінах да веруючых.

Самы лепшы спосаб агітацыі супроць рэлігіі—гэта навуковая лекцыя ці даклад. Калі ў ячэйцы няма каму прачытаць падобную лекцыю, то лепш за ўсё—трэба організаваць чытку на кніжках, якія льга дастаць у раённай бібліотэцы, ці у асобных партыйцаў.

У мясцовых варунках можна найсьці шмат спосабаў антырэлігійнай прапаганды.

У вёсцы часта спатыкаюцца такія справы, якія самі па сабе дапамагаюць вызваленьню ад рэлігіі і веры ў бога. Вось возьмем такі прыклад: у вёсцы Станькава, аднаго разу вясковы поп, будучы тут на хрэзьбінах, напіўся да адказу самагонкі. Ідучы па вуліцы з сваёй батрачкай поп пусьціўся ў прысядкі. Комсамольцы казалі, што так лоўка скакаў—як ніхто ў вёсцы—і поп, як бачыце, ведае гэта штукарства скокаў лепш, чым хто «грэшны» на зямлі.

Альбо яшчэ: нярэдка поп, у зьвязку з малой аплатай беднякамі шлюбу, хаўтур ці хрэзьбін, зусім адмаўляецца служыць імшы бо: «служыць бедняку дарам—няма шанцу».

Калі прыходзіць селянін і нясець грошы не па таксе, ці дасць мала збожжа, мяса і інш, дык поп проста гоніць вон.

Бачучы такія адносіны з боку «богаслужэбнікаў» сялянства само адмаўляецца ад рэлігіі. Такіх прыкладаў можна сабраць шмат, яны ў разных мясцах праходзілі па рознаму.

Гэтыя моманты комсамольскімі ячэйкамі могуць быць скарыстаным рознымі способамі ў агітацыі супроць багоў і папоў. Узяць блізкія прыклады, гаворачыя селяніну аб непатрэбнасьці рэлігіі, гета янача, лепш, як чым небудзь даказаць непатрэбнасьць веры ўва ўсякіх чарцей, багоў і інш.

У хаце-чытальні трэба організаваць чыткі з беспартыйнай моладзьдзю на тэмы: адкуль узяліся каляды, крыжы-абразы, хрэзьбіны і інш.

Па магчымасьці, дзе ёсьць падрыхтаваныя таварышы, зрабіць даклад—«Малебен ці трактар»—(Рэлігія і сельская гаспадарка). Заміж угнаеньня глебы ў часы неўраджаяў ці сухмянёў звычайна сяляне рыхтуюць малебны, абыходзячы палі цэлай вёскай на чале з папом і царкоўнымі прыладамі. (Пратэсамі ды абразамі) Гэтым дакладам трэба давесьці, што не малітвы выратуюць ад неўраджаяў ды сухменяў, а добры плуг, трактар ды штучнае ўгнаеньне.

Супроць угнаеньня з ражном ня пойдзеш, яно зробіць сваю справу на карысьць палёў.

Вось дзень анты-рэлігійнай комсамольскай ячэйкі ў часы каляд. Наша анты-рэлігійная кампанія не абмяжоўваецца выключна калядамі.

Трэба гэту працу праводзіць у далейшым сыстэматычна, выяўляючы шкоднасьць рэлігіі селяніну.

Калі гэта ячэйка ўсвоіць і прывядзе ў жыцьцё, дык вынікі працы будуць відавочны.

Раней, чым пачаць якую небудзь працу па гэтаму пытаньню, трэба парадзіцца з партячэйкай, райорганізацыяй, кіруючыся ўказаньнямі акружкому. Акрамя гэтага, як зазначана вышэй, ячэйка сама павінна быць моцна падрыхтаванай...

Цяпер хлопцы я-б хацеў, каб кожны з вас раней прачытаў маленькую вельмі цікавую кніжку: «Ячэйка проціў бога»—яна дапаможа вам пазбыцца магчымых памылак у працы.

І—урэшце, памятайце, хлопцы, што вельмі трэба ахоўваць аўторытэт і вартасьць ячэйкі і ЛКСМ. Гонар комсамольца не павінен быць забруджаным, ня трэба рабіць ніякіх выпадкаў, якія толькі шкодзяць справе.

А. Гаруновіч.

Што сказаў Зьезд корэсподэнтаў у Маскве.

(Мае ўражаньні).

(Працяг).

Адчыненьне з'езду.

З ўсіх кутkоў нашага саюзу Савецкіх Рэспублік сабраліся на ўсесаюзны з'езд корэсподэнты у Маскву абгаварыць свае пытаньні. Вось дэлегат з Каўказу. Ен кажа, што ў іх ёсьць такія мясцовасьці дзе ня было царскай улады й няма савецкай, вось якія там яшчэ абставіны.

Дэлегаты з Сібіру ў цёплых кажухох і валёнках прыехалі: там ужо завеі й мароз бярэ сваё. Побач з гэтым вырастаюць фігуры рабочых корэсподэнтаў, як з Ленінграду, Донбасу і г. д. Шахцёры растлумачваюць, як яны здабываюць вугаль з-пад зямлі. Дзе ні паткніся, усюды адчуваеш, што папаў у сваю родную сям'ю корэсподэнтаў. Сабралася на з'езд да 200 корэсподэнтаў. Зьезд адчыніўся пятага сьнежня вечарам.

Пасьля шматлікавых прывітаньняў ад корэсподэнцкіх організацыяў, з вялікім дакладам выступае т. Зіноўеў.

Рух корэсподэнтаў ёсьць вялікі пачын,

зазначае т. Зіноўеў. У нас ужо ёсьць да 50000 толькі рабкораў, якія вышлі з гушчаў працоўных мас, што і зьяўляецца куском практычнага ленінізму.

Ленін казаў, што кожны завод павінен быць крэпасьцю нашай партыі, а вёска хаця акопам пралетарскай дыктатуры. І тут таксама павінен дапамагчы рабкор і селькор.

Далей т. Зіноўеў гаварыў аб становішчы селькора, які дапамагае зьвязываць вёску з горадам, які церав цёмныя сілы вёскі працягвае руку гораду. За гэта на яго нападаюць.

Тут селькору павінен дапамагчы рабкор. Стаць яго кіраўніком і старшым братам.

Ад імя юнацкіх газэт гаварыў Мішка Заблудоўскі ад Ленінградзкай організацыі комсамолу.

У нядзелю 7 сьнежня, схадзіўшы ў маўзалей Леніна, а 10-й гадзіны раніцы, зьезд прыступае йзноў да працы.

Тав. М. Ульянава робіць даклад аб выніках рабкораўскага руху за прошлы год. Партыя досыць шмат зьвярнула ўвагу на рабкораўскі рух і 13 зьезд партыі выказаўся, што партыя павінна дапамагаць корэсподэнцкаму руху. Выбарнасьці ніякай не павінна быць. Корэсподэнцкая організацыя павінна быць дабравольнай. Корэсподэнты не павінны мець мандаты ды білеты, а добрыя вушы й вочы, тады толькі ён сумее стаць грамадзянскім працаўніком.

Мала яшчэ ў корэсподэнцкую працу ўцягнута жанчын і трэба старацца, як найбольш уцягваць іх у працу.

Партыя знаёміць корэсподэнтаў з профсаюзамі, організоўвае экскурсіі і г. д.

Партыя кіруе рабкораўскім рухам.

Тав. Варга—прадстаўнік комінтэрна вітае зьезд ад імя закардонных коррэсподэнтаў, якім вельмі цяжка змагацца пад прыгонам. Але рух корэсподэнцкі за кардоннам усё-ж такі пашыраецца

Нарэшце т. Варга пажадаў усім корэсподэнтам яшчэ энэргічней ўзяцца за працу. Вячэрняе пасяджэньне закончылася прывітаньнем ад чырвоных дырэктароў г. Масквы, заключнай прамовай т. Сьляпкова і дакладам т. Сырцова аб корэсподэнтах і культурнай працы.

Толькі пісаць у газэту гэтага мала.

Церав цывілізацыю да соцыялізму, сказаў наш бацька Ленін. Толькі ад культурнага ўзросту залежыць разьвіцьцё нашай гаспадаркі і прамысловасьці, а ў нашай краіне шмат яшчэ няпісьменных, ня добра наладжана праца тых ці іншых культ-організацыяў і г. д. Дапамагаць ліквідаваць няпісьменнасьць, наладзіць працу хаты-чытальні, растлумачваць значэньні МОПР'у, пав. флёту і г. д., падбіраць вёсцы п'есы й кніжкі, правілова высьвятляць на старонках газэты аб гэтай працы настроі сялян—вось якія яшчэ заданьні корэсподэнта.

Аб селькорах.

Селькор зьяўляецца абаронцам клясавых поглядаў у вёсцы. Кулакі як мага стараюцца прасунуць сваю лапу ў камітэт дапамогі, сельраду і г. д. Селькор сваімі грудзьмі абараняе ўладу саветаў у вёсцы, на яго за тое нападаюць ці забіваюць, каб прасунуць кулацкую ідэю. Селькорам трэба змагацца за заваёвы кастрычніка ў вёсцы.

Справа з селькорамі больш сур'езная чымся з рабкорамі. Рэдакцыі трэба, каб за кожнай заметкай пільна сачылі, былі на варце абароны сваіх селькораў.

Рабкораўскія-ж організацыі павінны браць шэфства над селькораўскімі.

М. Лазарчык.

Допісчыкам газэты „МАЛАДЫ АРАТЫ“

Пішэце, як праходзіла калядная антырэлігійная кампанія.

Ал. Дудар.

* * *

Я сягоньня песьняю вясёлай
Закружу, заленю шыр палей,
Бо у шэрых Беларускіх сёлах
Засьвяціла сонца весялей.

Адгрымела бура-навальніца,
Затанула ў буйным сонцацьвеце,
Зацьвіла вясёлая зарніца—
Там дзе выў п'яны брадзяга
вецер.

Равуцца думкі—бешаныя коні,
Праз вяршыны мараў недасяжных,
Гэта мы у яснае сягоньня,
Правадзілі зямлю з сонцам зьвяжам.

Глянь жа, глянь патухшымі вачыма,
Як блішчыць сьлязьліваe ваконца:
Гэта тушыць тусклую лучыну
Залаты агонь электра-сонца.

Ну, ці думаў хто у вашы годы
Што загляне сонца ў нашы хаты,
Што у нашы дні закарагодзіць
Па палёх сталёвы гулкі трактар?..

Расказаць—няма такога слова;
Апяяць—няма такой музыкі...
Толькі крыкнуць! З нашых каласоў
Назаўсёды ўсе заломы зьніклі

Ну і як-жа мне ня быць вясёлым,
Як спыніць пабеды горды ўздым,
Калі к шэрым беларускім сёлам,
Прывязалі сонца праўды.

Полацк, 27 сьнежня,
1924 году.

Дапрызаўная падрыхтоўка.

Пачатак збору.

(В. Старынкі, Койданаўскі р.).

Усіх допрызынікаў -145 чал. з іх—9 комсамольцаў, з якіх створаны комсамольскі колектыў.

З першага-ж пасяджэньня нагрузіліся працай: Рэдкалегія нась ценнай газэты «Голас чырвонага дапрызыўніка». Загад кугкамі бібліотэкай, драм гуртком.

Пасьля вайсковых заняткаў штодзённа, дапрызыўнікі слухаюць у хаце-чытальні лекцыі на розныя тэмы.

За апошнія часы прыметна цяга моладзі ў комсамол.

Акрамя лекцыяў па сель.-гасп. дапрызыўнай падрыхтаўцы МОПР'у і інш, праводзіцца політчас.

А. Гэзоін.

„Гарбатага“ каўпак справіць.

(Даўговіцкая яч., Раснянскі р.)

У нашай ячэйцы сэкрэтаром быў вясковы хлопец І Каліненка.

Паслалі яго як сур'eзнага хлопца на коопэрацыйнаю працу.

Не пабыў на працы аднаго месяцу, як пачаў „непазнаваць“ хлопцаў з свае ячэйкі ды пачаў дрэнна адносіцца.

Ня раз ужо зазываў яго новы сэкрэтар нашай ячэйкі, усе хацеў справіць, але дзе там—„Адзін шкляны каўпак „гарбатых“ справіць“.

І. Сяргееў,

Каўпаку для учоту.

(Заболоцкая яч., Менскай акр.).

Прыслалі шэфы (зав. Пролетары і Варшавянка) нам кніжак у бібліотэку, портрэты правадыроў. Прыдзі да бібліотэкара ўзяць кніжку пачытаць дык атрымаеш адзін адказ «не ўзяты на ўчот прысланыя кніжкі».

Так і ляжаць кніжкі пад ложкам у Дзядзюлі, а малюнкі правадыроў у хаце сабе повесіў..

Каўпак научы Дзядзюлю як на ўчот кніжкі браць.

Н.

„Гуляў ды гуляў... гуляў нагуляўся“.

(Высачанскі р., Віцебскай акр.)

Комсамолец Чаркасаў Дзяніс, Высачанскай ячэйкі аднаго разу нажлухаўся самогонкі. З левага боку прычапіў значок КІМ'у, а з правага вясельныя кветы ды пашоў шаферам да аднаго суседа.

Патрымаў у царкве вянок, ды зноў на папойку „Саматужнай“.

Вось як прасьнецца ганаровы шафер „пад шкляным каўпаком“ дык і запяе:

Гуляў ды гуляў, гуляў нагуляўся.

Комсамол штурхнуў мяне,—пад каўпак папаўся...

Чаркасаўскі.

ПОШТА

БУЛКІНУ ЯНКУ (Віцебшчына) Матар'ялы аб 6-ай гадавіне ЛКСМБ спазьніліся, ня пойдуць напісаны досыць добра. Старайся у другі раз прысылаць раней,

Л. Вялоўічу (Чэрвеншчына) Корэсподэнцыя спазьнілася.

КАРЖЭЛЮ Напішы свой адрас і прозьвішча, дык надрукуем, ці накіруем у належнаю установу дзеля высьненьня.

І КАВАЛЬЧУКУ Прышлі адрэс тады падрукуем.

КРАУЦОВУ: Перадалі у «Маладняк» Чытай новаю літаратуру. Перад тым як слаць вершы у друк—дык добра сам прагледзі мо' трэба дзе выправіць.

НАЖЫЦКАМУ 1 студзеня артыкул аб 6-ай гадавіне ЛКСМБ ніхто ня піша. Позна.

НЕВЯДОМСКАМУ: Цемны зьмест у тваіх частушках, незразумелы. Вершы трэба пісаць больш старанна, а не «з налету».

ЮХА (Шацкі раен) „Першы вопыт“ Скарыстаем у наступных нумарох „Маладога Аратага“.

КОМКОР: Велік. Трэба прыслаць поўны адрэс і правдзівае прозьвішча, тады надрукуем.

МАЛЕВІЧУ Артыкул «розьніца жыцьця мінулага і сучаснага» ня пойдзе, бо кожны гэту розьніцу знае з уласнага жыцьця, а не дык чытаючы кнігі.

Пісаць вершы умееш трэба больш чытаць новых Беларускіх поэтаў—«Маладняк».

ДРЭЙЦАРУ; «Да гадавіны сьмерці У. І. Леніна» скарыстаем.

2-я друк.-літ. «БДВ» 3100 экз. Галоўліт № 5558